*На кніжную паліцу*

# ПІСЬМЕННІКІ І МАСТАКІ – КРАЯЗНАЎЦЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

## ПА СТАРОНКАХ ВЫДАННЯ М. ПІВАВАРА "КРАЯЗНАЎЦЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX – ПАЧАТКУ XXI ст."

Набыццё беларускім народам дзяржаўнага суверэнітэту ў 1991 г. з'явілася магутным штуршком для актывізацыі краязнаўчых даследаванняў у нашай краіне. У апошнія гады выйшаў шэраг цікавых выданняў па гісторыі роднага краю. Сярод іх кнігі "Даследчыкі роднага краю. Краязнаўцы і гісторыкі – ураджэнцы Магілёўшчыны: біяграфічна-бібліяграфічны паказальнік" (Магілёў, 1995) і "Оршанские краеведы: биографический справочник" С. Івановай (Орша, 2002).

Чарговым падобным выданнем і адначасова першым біябібліяграфічным даведнікам новага тыпу стала кніга Мікалая Півавара "Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст.", якая выйшла ў свет у канцы 2010 г. у мінскім выдавецтве "Кнігазбор". Яна стала працягам выдадзенага ў 2006 г. даведніка "Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.". У новым выданні змяшчаецца інфармацыя пра 573 асобы краязнаўцаў-аматараў, настаўнікаў, выкладчыкаў ВНУ, навукоўцаў і супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў, музейных работнікаў, бібліятэкараў, журналістаў, якія даследавалі і даследуюць гісторыю і культуру Віцебшчыны.

У прадмове да названай кнігі аўтар адзначае: «Ідэя стварэння даведніка "Краязнаўцы Віцебшчыны" ўзнікла прыблізна ў 2001 г. пры падрыхтоўцы дысертацыйнага даследавання "Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 1961 – 1991 гг.". У ходзе працы былі вызначаны асноўныя тэндэнцыі, характэрныя рысы, асаблівасці дзяржаўнага, школьнага і грамадскага кірункаў краязнаўства ў нашай краіне ў той час, зроблены пэўныя вывады. Аднак дакументы не дазвалялі "ўбачыць за лесам дрэваў". Хто былі тыя людзі, якія вывучалі наш край? Якімі яны былі? Чаго хацелі? Што падштурхнула іх да цяжкай, часта няўдзячнай працы на ніве краязнаўства?

…Былі вывучаны асобныя фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, ведамасных архіваў розных дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый, якія даследуюць гісторыю і культуру Віцебскай вобласці ў сучасных адміністрацыйных межах. Карпатліва аналізавалася літаратура, асабліва мясцовыя перыядычныя выданні ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Віцебскай абласной бібліятэцы і раённых кнігасховішчах рэгіёна. Праведзены сотні інтэрв'ю, анкетаванняў…»

Знаёмства з кнігай "Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст." дазваляе зрабіць выснову, што найбольш актыўныя, руплівыя, неардынарныя краязнаўцы гэтай вобласці – пісьменнікі, мастакі і мастацтвазнаўцы.

У кнізе М. Півавара падаюцца штрыхі да партрэтаў гэтых цікавых людзей, аўтар імкнецца паказаць іх уклад у развіццё краязнаўства на Віцебшчыне.

Жыхары Беларусі ведаюць Уладзіміра Караткевіча як выдатнага беларускага пісьменніка. Але мала каму вядома, што ўраджэнец горада Оршы, арыгінальны паэт і празаік, быў адным з найбольш актыўных краязнаўцаў малой радзімы. Так, ён вёў праграму "Спадчына", якая ішла на беларускім тэлебачанні і асвятляла мінулае нашай краіны: яе гісторыю, старадаўнія кнігі, адзенне, помнікі даўніны. Асобная перадача была прысвечана Полацку і Полаччыне.

Артыкулы У. Караткевіча ў перыядычным друку закраналі пытанні аховы старажытных помнікаў, нацыянальнай спадчыны. Пісьменнік дбаў пра стварэнне музея народнай архітэктуры і побыту.

У складзе экспедыцыі сектара збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы АН БССР ён у ліпені 1971 г. даследаваў Бешанковіцкі, Чашніцкі і Лепельскі раёны Віцебскай вобласці, у жніўні 1971 г. – Бярэзінскі запаведнік, а ў 1975 г. – Сенненскі раён.

Апантаным краязнаўцам была і жонка пісьменніка, кандыдат гістарычных навук Валянціна Браніславаўна Караткевіч, якая працавала навуковым супрацоўнікам Ашмянскага краязнаўчага і Брэсцкага гісторыка-краязнаўчага музеяў, старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Яна брала актыўны ўдзел у стварэнні "Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" і была членам яго рэдкалегіі. Валянціна Браніславаўна – аўтар больш чым 100 артыкулаў у названым выданні, прысвечаных помнікам археалогіі, архітэктуры, славутым землякам, Героям Савецкага Саюза – ураджэнцам раёнаў і гарадоў Віцебшчыны, а таксама кнігі "Памятники истории Витебска" (1975).

Ужо шмат гадоў займаецца краязнаўчай дзейнасцю ўраджэнец Полацка пісьменнік Уладзімір Арлоў. Яго найлепшым даследаваннем, прысвечаным роднаму краю, можна лічыць кнігу "Та-

ямніцы полацкай гісторыі" (1994, 2001). Акрамя гэтага, пісьменнік з'яўляецца аўтарам шэрагу краязнаўчых артыкулаў, сцэнарыяў дакументальных фільмаў "Ефрасіння Полацкая" (1989) і "Беларускія матывы" (1990).

Пісьменніца Марыя Баравік даследуе гісторыю гарадскога пасёлка Падсвілле Глыбоцкага раёна і яго ваколіц, жыццёвы шлях Я. Драздовіча, І. Буйніцкага. У экскурсіях яна выкарыстоўвае ўласныя вершы. М. Баравік распрацавала даведнік "Падсвілле. Штрыхі мінулага і сучаснага". Ёй удалося адшукаць фрагмент карціны Я. Драздовіча "Зачараваны замак" у вёсцы Азеркі Пліскага сельсавета.

Жыхары Віцебшчыны па праве ганарацца сваім земляком, ураджэнцам Расонаў, паэтам, перакладчыкам, літаратуразнаўцам і актыўным краязнаўцам Анатолем Канапелькам. Ён аўтар навуковых прац, прысвечаных творчасці пісьменнікаў, чыё жыццё і дзейнасць былі звязаны з Віцебшчынай. Толькі ў рубрыцы "Анталогія беларускай паэзіі" газеты "Народнае слова" друкаваліся матэрыялы пра 55 выбітных асоб, пачынаючы ад Ф. Скарыны, С. Полацкага, Я. Баршчэўскага. У 2003 г. пасля смерці А. Канапелькі яны выйшлі асобным выданнем "Старонкі творчых біяграфій".

Генадзь Каханоўскі быў не толькі вядомым беларускім пісьменнікам і літаратуразнаўцам, але і таленавітым гісторыкам, археолагам, фалькларыстам, музеязнаўцам. А яшчэ ён быў апантаным краязнаўцам, папулярызатарам краязнаўчай і музеязнаўчай навукі, ініцыятарам стварэння і старшынёй Беларускага краязнаўчага таварыства (1989).

Многія даследчыя матэрыялы Г. Каханоўскага прысвечаны Віцебшчыне. Адна толькі манаграфія "Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст." утрымлівае шмат звестак пра краязнаўцаў XVII – XIX стст., якія вывучалі Віцебшчыну. Некаторыя артыкулы Г. Каханоўскага надрукаваны ў кнігах "Памяць" гарадоў і раёнаў Віцебшчыны, навуковых перыядычных выданнях краіны.

Пісьменнік Ілья Клаз быў літсупрацоўнікам бюлетэня "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі". Ён аўтар аповесці "Жарцы", дзе на аснове гістарычнага матэрыялу апісваюцца падзеі вайны 1812 г. на Віцебшчыне. У зборніку "Потомству в пример" адлюстраваны лёс ураджэнцаў Віцебшчыны А. Кзарскага і Я. Фаміна [аднаго з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці. – ***Э. І.***]. Пяру І. Клаза належыць мастацкі нарыс "Па Дзвіне на вёслах", прысвечаны геаграфічным і гістарычным асаблівасцям Віцебшчыны.

Адно з ганаровых месцаў сярод краязнаўцаў Віцебскай вобласці належыць паэту Віктару Леаненю, які цікавіцца гісторыяй населеных пунктаў і тапанімікай Полаччыны. Ён вядомы як аўтар зборніка вершаў "Хто можа схаваць агонь?", большасць з якіх прысвечаны Полаччыне. На жаль, сёння многія яго працы застаюцца ненадрукаванымі, у тым ліку "Храналогія Полацка з V ст. да нашых дзён", "Полацкія версіі (нататкі, эсэ, нарысы пра гістарычныя падзеі ў Полацку)", эсэ "Вадзяны дух. З гісторыі меліярацыі Віцебшчыны і Полаччыны".

Пісьменнік Уладзімір Міхно ў шматлікіх артыкулах у рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку асвятляе пытанні гісторыі і культуры Віцебшчыны, лёсы землякоў, даследуе помнікі прыроды, экалагічны стан Чашніцкага раёна, яго легенды і паданні.

Літаратурная грамадскасць Беларусі добра ведае Сяргея Панізніка як таленавітага паэта, публіцыста, грамадскага дзеяча. Пры гэтым ён адзін з самых апантаных краязнаўцаў Віцебшчыны. Асноўныя кірункі яго дзейнасці – літаратурнае краязнаўства, збор прадметаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, прапаганда гісторыі і культуры роднага краю. Яшчэ ў 1968 г. ён пачаў рабіць запісы песень, прымавак, тапанімічнага, іканаграфічнага і этнаграфічнага матэрыялаў. Менавіта С. Панізнік стаў аўтарам ідэі і ўкладальнікам зборнікаў гістарычнай літаратуры "Бацькаўшчына"; адкрыў свету імя паэта Э. Вайвадзіша.

Сяргей Панізнік – ініцыятар і стваральнік літаратурна-краязнаўчага музея "Хата бабкі Параскі" на ўласнай сядзібе ў вёсцы Цінкаўцы Верхнядзвінскага раёна, музея радзімазнаўства пры сельскай бібліятэцы ў вёсцы Лявонпаль Міёрскага раёна, літаратурнага музея Верхнядзвіншчыны пры раённай бібліятэцы.

Асобнае месца сярод краязнаўцаў Віцебшчыны належыць вядомаму паэту Давіду Сімановічу. Працуючы на абласным тэлебачанні, ён даследаваў і папулярызаваў жыццё і дзейнасць звязаных з Віцебшчынай творцаў, якія пакінулі значны след у літаратуры і мастацтве. Акрамя гэтага, Д. Сімановіч – аўтар краязнаўчых нарысаў "Подорожная Александра Пушкина", артыкулаў па гісторыі і культуры Віцебшчыны ў энцыклапедычных выданнях і кнізе "Памяць" горада Віцебска, кнігі "Витебский вокзал, или Вечерние прогулки через годы: дневники", якая змяшчае цікавыя звесткі па штодзённай гісторыі горада ў другой палове XX ст. Д. Сімановіч – адзін з арганізатараў стварэння Музея М. Шагала (1991), Літаратурнага музея Віцебска, Літаратурнага музея Віцебскага педінстытута (1980).

Адзін з самых актыўных краязнаўцаў Віцебшчыны – мастак Аляксандр Аніськовіч. Ён даследуе архітэктурную спадчыну Віцебшчыны і цікавіцца гісторыяй сваёй малой радзімы –

вёскі Лявонпаль Міёрскага раёна. Ён аўтар шэрагу культурных праектаў, сярод якіх "Помнікі гісторыі нашай Радзімы", дзе мастак асэнсоўвае ролю наваколля на шляху "з варагаў у грэкі", архітэктурную спадчыну Лявонпальшчыны; "Рака расказвае гісторыю" (частка інтэрнацыянальнага праекта "Дзвіна-Даўгава") і інш.

У 2000 г. у Віцебску выйшла ў свет кніга "Экскурсія да вытокаў горада Сянно: Краязнаўчы маршрут па раённым цэнтры Віцебскай вобласці" апантанага краязнаўца, мастака і педагога Васіля Бандарэвіча. Адзін з пераможцаў абласнога конкурсу "Мой родны кут" (1990 – 1992), В. Бандарэвіч удзельнічаў у краязнаўчых экспедыцыях па гістарычных месцах Беларусі, Літвы і Польшчы. Вынікам гэтых вандровак стаў збор біяграфічных звестак пра выбітных асоб, якія жылі і працавалі на Сенненшчыне: А. Зязюлю, К. Анікіевіча, К. Жэру, Т. Агінскага, Я. Фрэзера і іншых; тапаграфічнае апісанне горада Сянно і Сенненскага павета 1784 г.

Жыхарам Віцебшчыны добра вядома імя кандыдата мастацтвазнаўства Людмілы Вакар. Менавіта яна была ініцыятарам і арганізатарам рэспубліканскай выставы і навуковай канферэнцыі "Народны і гістарычны касцюм Віцебскай вобласці" (1991), рэспубліканскай выставы "Летуценні Язэпа Драздовіча", першага абласнога свята "Ганчарны круг-96" (Обаль) і першага рэспубліканскага свята "Ганчарнае кола-97" (Бачэйкава). Л. Вакар – аўтар шматлікіх краязнаўчых прац.

Прыхільнікам мастацтва не толькі ў Беларусі знаёмы працы арыгінальнага мастацтвазнаўцы і педагога, доктара мастацтвазнаўства Таццяны Катовіч. Шмат гадоў яна займаецца вывучэннем гісторыі Віцебскай мастацкай школы, тэатральнай культуры гэтага рэгіёна. Т. Катовіч – аўтар значных краязнаўчых артыкулаў, у тым ліку пра творчасць віцебскіх скульптараў, мастакоў, акцёраў, харэографаў. Найбольшую вядомасць набылі яе кнігі "Тэатральная культура Віцебшчыны XX ст.", "Энцыклапедыя рускага авангарду". Некаторыя каштоўныя дакументы Т. Катовіч перадала ў Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, дзе яна мае асабісты фонд.

Яшчэ адно імя з выдання "Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст." – мастак Уладзімір Краеўскі. Ён стварыў серыю карцін, дзе адлюстраваў помнікі архітэктуры Віцебска XIX – сярэдзіны XX ст., у тым ліку касцёл Святога Антонія, ратушу, забудову старога горада.

Кандыдат мастацтвазнаўства Аляксандр Лісаў займаецца вывучэннем мастацкай культуры Віцебска XIX – XX стст. Ён аўтар і суаўтар кніг "Художник Исаак Боровский", "Краязнавец Мікалай Каспяровіч", "Сапуновские места Витебска и окрестностей", "Историк В. Вейгер-Рейдемейстер". Акрамя гэтага, пяру А. Лісава належаць артыкулы пра мастацкае жыццё і персаналіі Віцебска ў шматлікіх энцыклапедыях, зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый і на старонках мясцовага перыядычнага друку.

Таленавіты мастак Алесь Марачкін вядомы і як апантаны даследчык жыцця і творчасці Я. Драздовіча. У пошуках спадчыны "вечнага вандроўніка" ён абышоў і аб'ехаў усю Дзісеншчыну, сабраў багатую калекцыю рэчаў, звязаных з Я. Драздовічам, якая ўпершыню дэманстравалася ў 1979 г. на першай выставе твораў гэтага яркага мастака. А. Марачкін стаў ініцыятарам стварэння Музея этнаграфіі і мастацтва Я. Драздовіча ў саўгасе "Гарадзец" Шаркаўшчынскага раёна, дзе знаходзяцца такія карціны майстра, як "Кнігавыдаўцы ў друкарні Ф. Скарыны", "На руінах", "Беразвеч". Цікава, што менавіта А. Марачкін знайшоў на Шаркаўшчыне і перадаў у Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку асобнік Статута Вялікага Княства Літоўскага (шкада, што ў даведніку М. Півавара не ўказаны год гэтага выдання. – ***Э. І.***).

Імя мастака і краязнаўца Алеся Мемуса добра вядома не толькі на Віцебшчыне, але і далёка за яе межамі. Некалькі дзясяткаў гадоў ён праводзіў росшукі рэшткаў матэрыяльнай культуры на берагах Дзвіны, Віцьбы, Палаты, у Віцебску і Полацку. Яшчэ адным захапленнем даследчыка стала вывучэнне старажытнай і сярэднявечнай архітэктуры. Ён браў удзел у аднаўленні Пакроўскай царквы, касцёла Святой Барбары ў Віцебску. М. Півавар адзначае, што сваёй дзейнасцю гэты чалавек паўплываў на фарміраванне грамадскай думкі жыхароў Віцебска пра помнікі гісторыі і культуры. А. Мемус – аўтар шматлікіх краязнаўчых артыкулаў у часопісах і газетах Беларусі, ЗША, Польшчы.

Мікалай Півавар стварыў унікальную кнігу, якая будзе карыснай усім, каму неабыякавыя гісторыя і культура нашай Бацькаўшчыны ў цэлым і Віцебшчыны ў прыватнасці…

Разам з тым хацелася б выказаць некаторыя заўвагі. У многіх артыкулах аўтар не раздзяляе краязнаўцаў і даследчыкаў. Аднак не кожны даследчык гісторыі і культуры Віцебшчыны з'яўляецца краязнаўцам. Да таго ж не трэба забывацца, што "Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст." – біябібліяграфічны даведнік, дзе павінны быць змешчаны поўнае імя, даты жыцця, месца нараджэння, а таксама пералік краязнаўчых прац той ці іншай асобы.

У заключэнне варта адзначыць, што настаўнік і вучоны М. Півавар стварыў каштоўную і цікавую кнігу. Шкада, што яе наклад усяго 600 асобнікаў.

**Эмануіл ІОФЕ,**
доктар гістарычных навук.